**І. Р. КАЗАЧЭНКА,**
настаўнік-метадыст Лельчыцкай раённай гімназіі

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНАГА РАБОЧАГА АРКУША ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ Ў VI КЛАСЕ

Пры навучанні літаратуры добрай метадычнай падтрымкай настаўніку можа стаць інтэрактыўны рабочы аркуш. Гэта лічбавы сродак арганізацыі дзейнасці навучэнцаў з дапамогай вэб-сэрвісаў. У залежнасці ад пастаўленай мэты праца з ім можа ажыццяўляцца на працягу ўрока: ад вызначэння тэмы да этапу падвядзення вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстанне інтэрактыўных камп'ютарных заданняў стымулюе пазнавальную актыўнасць вучняў, дае магчымасць засвоіць пэўны матэрыял, развівае наглядна-вобразнае і абстрактнае мысленне, навыкі самастойнага пошуку, аналізу і ацэнкі інфармацыі. Падрыхтаваныя настаўнікам рабочыя аркушы прызначаюцца для самастойнай працы вучняў на ўроку ці дома.

Інтэрактыўны аркуш, апрача рабочай часткі, утрымлівае назву / подпіс і кароткую інструкцыю. Праца з ім прадугледжвае свабоднае выкарыстанне розных крыніц інфармацыі: як папяровых, так і інтэрнэт-крыніц.

У сваёй практыцы выкладання і навучання звяртаюся да розных вэб-сэрвісаў. Адзін з такіх рэсурсаў, Wizer.me, дае магчымасць стварыць шырокі спектр заданняў: адкрытыя пытанні, выбар адказу, супастаўленне, устанаўленне адпаведнасцей, запаўненне пропускаў у тэксце, выявы, табліцы, аўдыязапіс фрагмента адказу.

Інтэрактыўны рабочы аркуш дазваляе больш прадуктыўна арганізаваць працэс навучання, пры гэтым вучні рухаюцца паэтапна, паслядоўна. Настаўнік прысутнічае побач, накіроўваючы дзейнасць. У такой сітуацыі вучні больш упэўненыя, чым калі б перад імі ляжаў чысты аркуш паперы і на ім патрэбна было пісаць. Яны, асэнсоўваючы матэрыял, працуюць у сваім тэмпе, ажыццяўляюць самакантроль і самакарэкцыю, атрымліваюць зваротную сувязь у рэжыме рэальнага часу.

Разгледзім падрыхтаваны мною рабочы аркуш да ўрока беларускай літаратуры ў VI класе «Свет загадак і цудаў. Беларуская міфалогія» (гл. па спасылцы: *https://app.wizer.me/editor/preview/b1G7zEJR87pJ* *або* па QR-кодзе). Магчымасці сэрвісу дазваляюць побач з тэмай размясціць адпаведную выяву: партрэт, ілюстрацыю (мал. 1).




Мал. 1. Загаловак інтэрактыўнага рабочага аркуша

Пасля арганізацыйнага моманту звяртаюся да слоў У. Васілевіча: «Спрадвеку міфы існавалі не толькі ў іншаземным краі, але і на нашай беларускай зямлі. Тут, у нашым краі, «паміж пустак, балот», сярод палёў і лясоў, азёраў і рэк, на падворку і ў хаце, у паветры, вадзе і над зямлёю нібыта існавалі — жылі, валадарылі, гаспадарылі, дапамагалі ці шкодзілі — усе персанажы, якія склалі міфы нашай Бацькаўшчыны».

У інтэрактыўны рабочы аркуш уключаны відэафільм «Багі». Вучні могуць паглядзець яго на інтэрактыўнай дошцы (мультыбордзе), а таксама на ўласных гаджэтах, скарыстаўшы пры гэтым навушнікі. Пасля прагляду фільма шасцікласнікі адказваюць на прапанаваныя пытанні, напрыклад: «У якіх багоў верылі нашы продкі да прыняцця хрысціянства?».

Далейе прапаную вучням вызначыць мэты ўрока. Такую магчымасць дае функцыя «Суаднясенне элементаў» (мал. 2).




Мал. 2. Заданне на супастаўленне

На наступным этапе прапаную шасцікласнікам узнавіць веды пра тэрмін «міф» і выканаць заданне на запаўненне пропускаў (мал. 3).




Мал. 3. Заданне на запаўненне пропускаў у тэксце

У заданні «Пазнай язычніцкіх багоў» рабочага аркуша змешчаны выявы багоў, падказка і заданне «Адкрытае пытанне». Вучням патрэбна запісаць імёны міфічных персанажаў (мал. 4).




Мал. 4. Выява

На наступным этапе ўрока шасцікласнікам неабходна ўзнавіць веды пра духаў, якія, паводле нашых продкаў, аберагалі свойскую жывёлу і ўраджай, назіралі за гаспадаркай і побытам селяніна. Прапаноўваецца заданне «Групоўка аб’ектаў». Міфічных духаў трэба размежаваць, падзяліць на станоўчых і адмоўных (мал. 5).

Для таго каб зразумець, наколькі ўважліва вучні прачыталі тэкст артыкула «Міфы пра духаў», прапаную запоўніць табліцу. У гэтым заданні трэба пазначыць імёны персанажаў паводле дадзеных апісанняў. Вучні ўпісваюць імёны духаў у правую частку табліцы (мал. 6).

Для таго каб назваць ліхаманак — міфічных сябровак Бабы Ягі, будзе дарэчы заданне на супастаўленне: злева размешчаны дзеянні ліхаманак, а справа іх імёны. Гэтыя часткі трэба суаднесці *(гл. мал. 5)*.

На фінальным этапе ўрока праводжу рэфлексію з дапамогай задання «Адкрытае пытанне».

Такім чынам высвятляецца, наколькі складаным быў для шасцікласнікаў матэрыял; наколькі цікава / нецікава, цяжка / лёгка было выконваць заданні інтэрактыўнага аркуша, ці задаволены вучні сваёй працай на ўроку.

Дамашняе заданне таксама пазначана ў рабочым аркушы.

Зразумела, для працы з інтэрактыўным рабочым аркушам вучням неабходна адкрыць доступ. Папярэдне ў «журнале» запаўняюцца графы з імёнамі навучэнцаў. Пасля блакіроўкі доступ да аркуша спыняецца, вучні не могуць далей працаваць, дадаваць адказы, уносіць карэктывы. Наяўнасць зваротнай сувязі і гнуткай сістэмы ацэньвання вынікаў дзейнасці вучняў дазваляе зрабіць працэс навучання больш эфектыўным.

Настаўнікі маюць магчымасць карыстацца не толькі самастойна створанымі інтэрактыўнымі аркушамі, але і спампоўваць ужо падрыхтаваныя, назапашваючы ўласную скарбонку такіх метадычных прадуктаў. Інтэрактыўныя аркушы у фармаце pdf можна таксама раздрукаваць, каб выкарыстаць у якасці плана-канспекта да ўрока. Для гэтага трэба націснуць на кнопку Print у правым верхнім кутку інтэрактыўнага аркуша.




Мал. 5. Заданне «Групоўка аб'ектаў»


Пазнайце міфічных герояў па апісанні.

| Апісанне міфічнай істоты | Яе імя |
|---|---|
| Меў надта вялікія вушы, якімі чапляўся за дрэвы і кустоўе, і белы, як бяроста, твар. | |
| Яго транспартным сродкам быў сом. | |
| Раніцаю палохаў пеўня, каб той своечасова разбудзіў сям'ю. | |
| Заманьваў чалавека на сянцапёк і там закалыхваў да непрытомнасці. | |

Мал. 6. Табліца

Вучні маюць магчымасць працаваць з інтэрактыўным аркушам не толькі ў класе, але і дыстанцыйна, для чаго патрэбны камп'ютар (планшэт, смартфон) з выхадам у інтэрнэт. Пры індывідуальнай самастойнай працы навучэнцы могуць выконваць заданні ў зручны час.

Як можна пераканацца, інтэрактыўны рабочы аркуш дае магчымасць візуалізаваць, прэзентаваць у выглядзе выяў, аб'ектаў, табліц вучэбную інфармацыю, каб зразумець і засвоіць яе было максімальна зручна.

Інтэрактыўныя рабочыя аркушы разлічаны на шматразовае прымяненне (у паралельных класах, у розны час). Яны складаюць частку ўласных метадычных напрацовак, настаўнік можа апублікаваць іх на персанальным сайце.

Прыклады інтэрактыўных рабочых аркушаў у сэрвісе Wizer.me можна знайсці на маім асабістым прафесійным сайце (гл. па спасылцы: https://presentdaymova.wordpress.com/ і па QR-*кодзе)*.

**Спіс выкарыстанай і рэкамендаванай літаратуры**

*Калядзіч, Н.* Па ўласным адукацыйным маршруце : [аб арганізацыі дыстанцыйнага навучання : з вопыту сталічных педагогаў] / Н. Калядзіч // Настаўн. газ. — 2021. — 6 мая. — С. 14.

*Котельникова, Н. Н.* Интерактивные рабочие листы как новый способ познавательной активности детей [Электронный ресурс] / Н. Н. Котельникова. // EduNeo. — Режим доступа: *https://www.eduneo.ru/interaktivnye-rabochie-listy-kak-novyj-sposob-poznavatelnyx-dejstvij-detej-na-primere-poiska-vesennego-probuzhdeniya-prirody.* — Дата доступа: 12.09.2020.

Міфы Бацькаўшчыны / уклад. У. А. Васілевіч. — Мінск : БелЭн, 1994. — 108 с.